**Карпекін, К.** Як вясковы храм стаў цэнтрам епархіі / К. Карпекін // Народнае слова. – 2010. – 7 жн. – С. 6.

## ЯК ВЯСКОВЫ ХРАМ СТАЎ ЦЭНТРАМ ЕПАРХІІ

**Гісторыя час ад часу падносіць сюрпрызы. Нечаканасці могуць здарыцца калі заўгодна і праявіцца самым незвычайным чынам. Здаўна ў Высачанах, што на Лёзненшчыне, была праваслаўная царква. І не дзіва: гаспадарамі маёнтка з'яўляліся Гуркі-Рамейкі – славуты дваранскі род. Звычайны маёнтак, звычайная царква. А тут пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, у 1920-я гг., яна стала галоўным храмам цэлай епархіі! Праўда тое доўжылася нядоўга. Неўзабаве царкву чакалі занядбанне, разбурэнне і забыццё. Сёння напамінкам пра яе з'яўляецца адзін падмурак. Ды і вёска Высачаны цяпер вядомая, бадай, толькі заўзятым краязнаўцам.**

Храм пабудаваны ў 1843 г. па ініцыятыве Уладзіміра Іосіфавіча Гуркі-Рамейкі, які ў той час з'яўляўся гаспадаром маёнтка Высачаны. Ул. Гурка прысвяціў яе Сашэсцю Святога Духа на апосталаў. Царква была каменнай. І званы, і ўнутры храм выглядаў шыкоўна, у тым ліку дзякуючы драўлянаму разному іканастасу.

Зусім верагодна, што і да гэтага ў Высачанах быў праваслаўны храм, бо ў Свята-Духаўскай царкве захоўвалася шмат чаго цікавага. Згадаць хаця б звон 1791 г. Як сведчыў зроблены на ім надпіс, звон быў адліты паводле загаду Іосіфа Гуркі. Таксама царква мела багаты архіў і бібліятэку. Самыя старыя архіўныя дакументы сягалі ў 1804 г. А яшчэ ў высачанскай царкве захоўваліся абразы XV–XVI стст. Яны былі «ахвяраваныя сюды маскоўскім Успенскім саборам у 1866 г.»

Ціша і спакой высачанскага маёнтка і царквы былі парушаны Кастрычніцкай рэвалюцыяй. Як вядома, вясной 1922 г. з усіх храмаў вывозіліся каштоўнасці, якія нібыта накіроўваліся галадаючым Паволжа. Тады і Свята-Духаўская царква пазбавілася некалькіх дзесяткаў срэбных рэчаў.

Адначасова 1922 г. даў пачатак незвычайнаму павароту падзей. Справа ў тым, што пасля дзевяцігадовага перапынку ў высачанскую царкву вярнуўся яе колішні святар Міхаіл Свідэрскі. Яго вяртанне было невыпадковым. У пачатку 1920-х гг. унутры праваслаўнай царквы ўзнік гэтак званы абнаўленчы рух. Яго прыхільнікі выказваліся за некаторыя змены ў богаслужэннях, у параўнанні з іншымі праваслаўнымі больш лаяльна ставіліся да савецкай улады. Менавіта М. Свідэрскі быў прызначаны адным з абнаўленчых епіскапаў. Яму падпарадкоўвалася на той час Веліжска-Высачанская епархія. На яе тэрыторыі знаходзілася нямала цэркваў, але сваёй «рэзідэнцыяй» М. Свідэрскі зрабіў менавіта вясковы храм. Мабыць, аддаленасцю ад вялікіх гарадоў, дзе вiравала жыццё, а мабыць, яшчэ і тым, што знаходзіўся ён на пагорку, адкуль адкрываліся чароўныя краявіды.

Але і тут не было спакою. У 1925 г. Высачанскі райвыканкам задумаў пабудаваць непадалёк ад царквы народны дом (тое, што мы сёння называем домам культуры). На думку будаўнікоў, у Высачанах мелася адзінае месца, прыдатнае да такой установы, – пляцоўка на ўзгорку, дзе стаяла царква. Больш таго, у нардоме планавалася ўсталяваць радыё, якое было б чуваць ва ўсёй вёсцы. Хутка распачаліся і самі будаўнічыя работы.

Натуральна, праваслаўнае насельніцтва было катэгарычна супраць такога суседства. Вернікі лічылі, што драўляны будынак гардома можа стварыць пажарную небяспеку для царквы, а

праводзімыя там канцэрты будуць замінаць набажэнствам. Пра ўсё гэта яны напісалі ў Віцебскі акруговы выканкам, просячы спыніць будаўніцтва.

Для вырашэння ўзнікшага пытання 27 чэрвеня 1925 г. у Высачаны прыехала спецыяльная камісія. Яна агледзела нардом, царкву і вырашыла, што згортваць будаўніцтва нельга, паколькі ў Высачанах больш не было дзе ставіць клуб (усё наваколле моцна зрэзана ярамі). Да таго ж пры перамяшчэнні нардом мог разваліцца, бо яго перабудоўвалі са старога свірна. Таксама камісія супакоіла вернікаў, што пажар царкве пагражаць не будзе, і што ніхто не збіраецца злаваць іх гучнай музыкай. Так што ў хуткім часе побач з царквой з’явіўся клуб.

Храм перажываў не лепшыя часы: не толькі з-за таго, што цяпер зусім побач праводзіліся танцы і спевы. Частка богаслужэбных рэчаў была адабрана, не хапала нават святарскага адзення. Але М. Свідэрскі знайшоў выйсце. Вось як пра сваю задуму епіскап пісаў у Віцебскі акруговы выканкам 3 верасня 1927 г.: «У Любашкаўскай царкве Віцебскай акругі Высачанскага раёна, даверанай мне Беларускім Свяшчэнным Сінодам, ёсць некалькі старых прадметаў архірэйскага адзення, якое засталося пасля памерлага і пахаванага ў 1879 г. у любашкаўскай царкве архіепіскапа Васіля Лужынскага (…) Паводле ўзгаднення са старшынёй любашкаўскага царкоўнага савета гэтыя рэчы, ужо моцна пашкоджаныя моллю і цвіллю, узяты мною і часткова выкарыстоўваюцца пры архірэйскім маім служэнні ў высачанскай царкве, часткова ж, пры неабходным рамонце, яны маглі б выкарыстоўвацца ў большай ступені, але каб гэта зрабіць прашу акрвыканкам пра дазвол залічыць гэтыя рэчы ў вопіс маёмасці высачанскай царквы (…)». Літаральна праз некалькі дзён – 12 верасня 1927 г. – неабходны дазвол быў атрыманы.

1930 год выдаўся для высачанскай царквы надзвычай цяжкім. У самым яго пачатку – 8 студзеня – Высачанскі райвыканкам пастанавіў зняць з яшчэ дзеючага храма званы і «чырвоным абозам» адправіць іх у Віцебск. Адчуваючы нядобрае, М. Свідэрскі сабраў усе царкоўныя каштоўнасці і ў ноч з 31 студзеня на 1 лютага адвёз іх на чыгуначную станцыю Крынкі, а адтуль – у Невель. Свята-Духаўская царква і сапраўды праз колькі дзён была зачынена. Архіўныя дакументы сведчаць, што праваслаўнае насельніцтва не губляла надзеі на вяртанне храма: «18 красавіка 1930 г. у Высачаны прыехаў святар, заявіўся ў райвыканкам, у міліцыю з мэтай рэгістрацыі. Калі старшыня райвыканкама дыпламатычным шляхам прапанаваў гэтаму святару лепш служыць у кабыльніцкай царкве, апошні катэгарычна адмовіўся і сказаў: «Народ патрабуе, ды і я маю загад ад уладыкі (епіскапа – **К. К.**) служыць у высачанскай царкве». Раённыя ўлады вельмі незадаволены адкрыццём царквы ў Высачанах і будуць узбуджаць хадайніцтва перад акрвыканкамам пра закрыццё, прымаючы пад увагу патрабаванне рабочай масы (высачанскай льнопрадзільнай – **К. К.**) фабрыкі К. Маркса». Ужо ў канцы красавіка 1930 г. высачанская царква была канчаткова зачынена.

Вось такой незвычайнай аказалася гісторыя адной вясковай царквы. Не кожны храм можа стаць саборам – цэнтрам епархіі, няхай сабе толькі на дзесяцігоддзе.

***Канстанцін Карпекін,***

**галоўны захавальнік фондаў**

**Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці.**